УДК 930 (476)+357.71

***І.І. Шаўчук***

# ПЕРАЎТВАРЭННЕ ІНБЕЛКУЛЬТА Ў БЕЛАРУСКУЮ АКАДЭМІЮ НАВУК

У артыкуле на падставе шматлікіх матэрыялаў, як уведзеных у навуковы ўжытак, так і неапублікаваных, рэканструюецца працэс стварэння Беларускай акадэміі навук. Разглядаюцца некалькі спробаў яе арганізацыі. Аналізуюцца іх прычыны, сярод якіх палітычныя, сацыяльна-эканамічныя і ўласна навуковыя. Робяцца высновы аб аб'ектыўна пазітыўным характары навукова-арганізацыйнага будаўніцтва ў рэспубліцы, нягледзячы на пазанавуковую матывацыю працэсаў, што аналізуюцца.

Гісторыя Інстытута беларускай культуры (ІБК), пераўтварэння яго ў Беларускую акадэмію навук (БАН, БелАН) знайшла адлюстраванне ў шэрагу публікацый. Гэтай тэме прысвяцілі свае даследаванні М.У. Токараў, У.М. Міхнюк, Р. Лінднэр і інш. [1; 2; 3; 4; 5]. Адлюстравана яна і ў калектыўных працах [6; 7]. У дадзеным шэрагу выдзяляюцца па змястоўнасці фактаграфічнага матэрыялу аб'ёмныя артыкулы У.М. Ігнатоўскага [8] і П.Ц. Петрыкава [9]. Тым не менш усе названыя працы, за выключэннем публікацыі У.М. Ігнатоўскага, аб'ядноўвае адзіны канцэптуальны падыход. Ён заключаецца ў існаванні быццам бы плана паступовага, паэтапнага стварэння БАН: арганізацыя Навукова-тэрміналагічнай камісіі, на яе базе – Інбелкульта, потым – Акадэміі навук. Аб тым, што такая схема ўяўляецца сумнеўнай, аўтар дадзенага артыкула ўжо пісаў [10].

Падаецца апраўданым казаць аб сталым жаданні, якое прысутнічала з пачатку 1920-х гадоў, найхутчэйшага стварэння Акадэміі навук. Аднак рэаліі абумовілі адносную пралангіраванасць дадзенага працэсу. Чарговым крокам у развіцці ІБК, які пачаў фактычнае існаванне ў 1921 г., стала палажэнне, абмеркаванае на пасяджэнні ЦВК, дзе старшынёй быў А.Р. Чарвякоў, сакратаром – У.М. Ігнатоўскі, і юрыдычна аформленае пастановай ЦВК і СНК БССР 25 ліпеня 1924 г. Тут не толькі нармаваліся арганізацыйныя пытанні функцыянавання інстытута, але і абвяшчалася, што ІБК з'яўляецца «вышэйшай дзяржаўнай навуковай установай у Беларусі, уваходзячай у склад Наркамасьветы БССР» [11].

Праз некалькі месяцаў, 8 кастрычніка 1924 г. А.В. Баліцкі на пасяджэнні СНК публічна агучыў думку: «... ІБК разгортваецца ў стала дзейнічаючую ўстанову з тэндэнцыяй паступовага пераўтварэння ў беларускую акадэмію навук». Для ўмацавання пазіцыі аб неабходнасці пашырэння дзейнасці ІБК і падвышэння яго статусу ў выступленні былі выкарыстаны і палітычныя матывы: «Далучэнне Усходняй Беларусі і практычнае правядзенне нацыянальнай палітыкі павялічваюць ролю і значэнне ІБК. Ён павінны стаць цэнтрам навуковай думкі ... сачыць за тым, каб беларуская культура развівалася ў адным рэчышчы, а для гэтага павінна быць створана аўтарытэтная навуковая ўстанова, да якой прыслухоўваліся б усе навуковыя арганізацыі не толькі ва Усходняй Беларусі, але і ў Заходняй.» У выступленні намесніка наркама асветы фармулююцца накірункі працы: «Асноўныя задачы *рэарганізаванага ў Акадэмію навук Інстытута беларускай культуры* (тут і далей курсіў аўтара) будуць па першым часе заключацца ... у вырашэнні дзвюх праблем – вывучэнне мовы і гістарычнага мінулага» [12, арк. 69, 73–76]. Прадстаўлена тут і праграма арганізацыйнай будовы. Прапаноўвалася на чале ІБК паставіць партыйнага навукоўца, а да наяўнай колькасці супрацоўнікаў камандзіраваць 2–3-х сталых работнікаў і 4–5 вучоных «высокай кваліфікацыі (ак. Карскі, праф. Доўнар-Запольскі,

праф. Растаргуеў, праф. Сонцаў, праф. Любаўскі, этнограф Сержпутоўскі і інш.)». У той самы дзень, калі быў зроблены даклад, пастанова СНК зацвердзіла практычна ўсе прапановы, якія ўтрымліваліся ў ім [12, арк. 78; 7, с. 12–13]. У лістападзе 1924 г. 3-я сесія ЦВК БССР прыняла рэзалюцыю, якая змяшчала наступны пункт: «Прызнаць патрэбным рэарганізаваць ІБК у пастаянную дзяржаўную вышэйшую навукова-даследчую, *па тыпу Акадэміі навук* установу, якая павінна заняцца сістэматычнай і планавай апрацоўкай пытанняў навукі і культуры, датычных БССР» [8, с. 15]. Дарэчы, расійскі даследчык Ф. Перчанок адзначаў: «Яшчэ ў 1924 г. кіраўнікі ІБК паставілі перад урадам Беларусі пытанне аб пераўтварэнні ІБК у БелАН» [13].

Прыведзеныя факты паказваюць, якія рэальныя думкі існавалі наконт навукова-арганізацыйнага будаўніцтва ў нацыянальных дзеячаў савецкай Беларусі. І словы А.В. Баліцкага, і рашэнні ЦВК сведчаць аб жаданні найхутчэйшага стварэння Акадэміі навук.. Падаецца, менавіта абмежаванасць інтэлектуальных рэсурсаў у сярэдзіне 1920-х гадоў не дазволіла прыступіць непасрэдна да арганізацыі Акадэміі навук. Тое, што такія планы ўжо фактычна «авалодалі масамі», пацвярджае, здавалася б, нязначны факт публікацыі ў ліпені 1925 г. прывітання пражскага Крывіцкага культурнага таварыства Інбелкульту як найвышэйшай беларускай навуковай установе, якое заканчвалася заклікам: «Няхай Інбелкульт у борздым часе стане Беларускай Акадэміяй Навук!» [14].

Такім чынам, стварыць Беларускую акадэмію навук метадам «кавалерыйскай атакі» не ўдалося. Беларускае кіраўніцтва мяняе тактыку і пераходзіць да паступовай метадычнай «аблогі»: побач з пашырэннем структуры ІБК, уцягненнем у яго дзейнасць усё большага кола прафесійных навукоўцаў і аматараў (у сакавіку 1925 г. ІБК налічваў 97 штатных і няштатных членаў, а ўсяго ў яго працу было ўцягнута 300 чалавек [15, арк. 9; 9, с. 62]) у цэнтральных органах СССР увесь час будзіруецца пытанне аб рэспубліканскай акадэміі. Так, 17 студзеня 1926 г. III канферэнцыя Галоўнавук саюзных рэспублік у сваім пратаколе адзначыла адносна ІБК: «... мяркуецца ў будучым рэарганізаваць у Беларускую Акадэмію Навук» [16, арк. 12].

Становішча ІБК як адной са шматлікіх устаноў Наркамата асветы ў свой час, магчыма, аблягчала правядзенне ўнутрыінстытуцкіх рэканструкцыйных мерапрыемстваў, не патрабуючы абавязковага ўзгаднення з маскоўскімі цэнтральнымі ўстановамі. Але ж гэтае становішча, па ўсёй бачнасці, звужала поле дзейнасці пры наяўным імкненні далейшых арганізацыйных зменаў. Менавіта таму, як падаецца, у лютым 1926 г. урад Беларусі павышае статус Інбелкульта, калі выводзіць яго з падпарадкавання НКА і робіць самастойнай установай пры СНК БССР. Для гэтага, дарэчы, быў прыклад – АН СССР, годам раней перападпарадкаваная з НКА ў ЦВК. Адначасова старшынёй прэзідыума інстытута зноў быў зацверджаны У. Ігнатоўскі, які ёй жа па ўласным жаданні вызваляўся ад абавязкаў наркама асветы [17].

Павышэнне статуса ІБК абумовіла павышэнне ўзроўню органаў улады, якія сталі вырашаць яго лёс. Так, ЦВК СССР 1 чэрвеня 1926 г. (паводле У. Ігнатоўскага – 4 чэрвеня [8, с. 17], паводле аўтараў «Інстытута беларускай культуры» 18 чэрвеня [7, с. 17–18]) у рэзалюцыі па дакладу беларускага ўрада адзначыў, што ІБК павінны стаць БАН [17, арк. 332]. Тое самае канстатавала ліпеньская пастанова СНК БССР: «... лічыць неабходным з 1926–1927 акадэмічнага года надаць ІБК напрамак да паступовага пераўтварэння яго ў Беларускую Акадэмію Навук ...» [19]. Зразумела, без канчатковага ўхвалення партыйнымі органамі падобныя мерапрыемствы не маглі быць ажыццёўлены. Аб узгадненні пытання паміж ЦК ВКП(б) і рэспубліканскай партарганізацыяй сведчыць снежаньская (1926 г.) пастанова бюро ЦК КП(б)Б аб неабходнасці змяншэння культурна-грамадскай работы ІБК і надання ёй больш акадэмічнага накірунку. Цалкам раскрывае партыйна-дзяржаўныя планы пасяджэнне бюро ЦК Кампартыі Беларусі ў студзені 1927 г., на якім фактычна паўтораны асноўныя

палажэнні ліпеньскай (1926 г.) пастановы СНК аб пераўтварэнні ІБК у БАН. У.М. Ігнатоўскі, пішучы пра гэтае пасяджэнне, якое мела месца 15 студзеня, засяроджвае ўвагу на адным з яго рашэнняў, а менавіта аб несвоечасовасці ў «дадзены момант» рэарганізацыі Інбелкульта ў Акадэмію навук [8, с. 21]. У 1999 г. М.У. Токараў, дэталізуючы канстатацыю папярэдняй публікацыі [7, с. 18], адзначаў: «Пра тэрміны ператварэння Інбелкульта ў акадэмію існавалі дзве думкі. Адна адлюстроўвала пункт погляду вышэйшых органаў кіравання рэспублікі, а менавіта: не спяшацца, а паступова падводзіць інстытут да рэарганізацыі ў акадэмію; другая – і гэта было жаданне кіраўніцтва Інстытута беларускай культуры – не адкладаючы, ужо ў канцы 1926 г. абвясціць пра стварэнне Беларускай акадэміі навук» [1, с. 8]. Тое ж ён сцвярджаў і пазней [3, с. 30]. Падобны падыход, але з іншымі акцэнтамі можна сустрэць у Г. Нямігі. Паводле яго меркавання, таксама існавалі дзве групы. Першая – «сьвядомы беларускі актыў», згрупаваны ў ІБК, які адцягваў пераўтварэнне ў БАН, таму што пачнецца «апаноўваньне... бальшавіцкімі элементамі, з насаджэньнем бальшавіцка-русіфікацыйнага зьместу... дзейнасьці ўстановы...». Другая – нацыянал-бальшавікі, згрупаваная ва ўрадавых колах, – прыспешвала такое пераўтварэнне [26, с. 36]. Аднак у матэрыялах сакрэтнага аддзела ЦК утрымліваецца інфармацыя аб тым, што бюро ЦК палічыла неабходным «...здзейсніць гэта перайменаванне ў сувязі са святкаваннем 10-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі. З аднаго боку, гэты факт будзе гаварыць аб адным з нашых дасягненняў, з іншага боку, ён звязвае БАН з імем Кастрычніка. БАН будзе першай, пакуль адзінай акадэміяй, якая створана рукамі Камуністычнай партыі і Савецкай улады, акадэміяй, якая не мае традыцыі дакастрычніцкага часу» [18, арк. 333].

Чарговая спроба стварэння Акадэміі навук аказалася, тым не менш, беспаспяховай. І гэта зразумела. Нягледзячы на 323-працэнтны рост фінансавання Інбелкульта з 1924 па 1927 г. (ад 77 906 да 329 530 рублёў) [20, арк. 75], праблема заключалася выключна ў навукова-кадравым патэнцыяле, у яго недастатковасці. Так, у 1925 г. адпаведна «Раскладу сапраўдных членаў ІБК па секцыях» з агульнай колькасці прыведзеных 57 прозвішчаў супрацоўнікаў 18 былі задзейнічаны ў адной секцыі, 35 – у двух і 4 – у трох [21, арк. 4]. Звярнуўшы ўвагу на персаналіі, адзначым намінальнасць удзелу ў працы ІБК многіх асобаў: Я.А. Адамовіч (старшыня СНК БССР), А.Р. Чарвякоў (старшыня ЦВК БССР і сустаршыня ЦВК СССР), А.І. Крыніцкі (сакратар ЦК КП(б)Б), З.Хв. Жылуновіч (кіраўнік Галоўархіва), А.В. Баліцкі (нам. наркама асветы), Я.П. Каранеўскі (заг. Галоўсацвыхавання НКА), А. Успенскі (заг. Галоўпрафадукацыі НКА), М.І. Мароз (заг. Белдзяржвыдавецтва), П. Растаргуеў (вядомы расійскі мовазнаўца, у Беларусі не жыў і не працаваў), А.К. Сержпутоўскі (супрацоўнік этнаграфічнага аддзела Рускага музея ў Ленінградзе, бываў у Беларусі наездамі, за 20 міжваенных гадоў наведаўся з навуковымі мэтамі 20 разоў [22, с. 13]) і інш. Але праблема заключалася не толькі ў намінальнасці ўдзелу. Сярод названых «Раскладам ...» людзей прафесійныя навукоўцы (паводле адукацыі і сферы дзейнасці) складалі нязначную меншасць – 10–12 чалавек, уключаючы двух апошніх.

Выказаная думка аб немагчымасці стварыць акадэмію з прычыны адсутнасці неабходнага кадравага патэнцыялу пацвярджаецца шэрагам фактаў. У прыватнасці, у канцы 1926 г. сацыяльна-эканамічная секцыя налічвала ў сваім складзе 34 асобы, сярод якіх былі прадстаўнікі ад ЦК КП(б)Б, СНК і ЦВК БССР, Наркаматаў земляробства, унутранага гандлю, фінансаў, рабоча-сялянскай інспекцыі, ЦСУ, Дзяржплана і яшчэ васьмі арганізацый, у тым ліку асобна пазначаны Інбелкульт і Цэнтральнае бюро краязнаўства [23, арк. 88], у той час як у секцыі планавалася на гэты год наяўнасць усяго аднаго штатнага супрацоўніка [24, арк. 79 адв.–80]. Такім чынам, і ў канцы 1926 і, напэўна, у 1927 г. ІБК усё яшчэ не пазбавіўся сваіх грамадскіх функцый. Нягледзячы на шэраг партыйна-ўрадавых рашэнняў аб наданні інстытуту выключна навуковага

характару, ён уяўляў своеасаблівы навукова-грамадскі цэнтр, у якім распрацоўваліся тыя ці іншыя мерапрыемствы, што тычыліся розных бакоў жыцця рэспублікі, і прымаліся адпаведныя рашэнні, амаль да кадравых прызначэнняў, прынамсі ў дачыненні да навукі і адукацыі. Магчыма, усё гэта мелася на ўвазе, калі палітбюро ЦК ВКП(б) 27 кастрычніка 1927 г. пастанавіла адкласці вырашэнне дадзенага пытання [3, с. 32].

Праца па стварэнні Акадэміі навук, тым не менш, не спынілася. Працягам яе стала юрыдычнае афармленне працэсу, што выявілася ў прыняцці прынцыпова новага статута Інбелкульта, створанага па аналогіі з адпаведнымі дакументамі Акадэмій навук СССР і Украіны. У акадэмічным статуце ІБК, зацверджаным СНК БССР 29 чэрвеня 1927 г. [25], вызначаліся прынцыпы арганізацыйнай будовы ўстановы, кадравай складовай і прадугледжвалася значнае пашырэнне абсягу навукова-даследчай дзейнасці. Цяпер інстытут быў падзелены на два аддзелы: прыроды і гаспадаркі і гуманітарных навук, нацыянальныя аддзелы сталі называцца сектарамі, больш дакладна фармуляваліся кваліфікацыйныя патрабаванні да супрацоўнікаў, далейшае нарматыўнае афармленне атрымала сістэма падрыхтоўкі маладых навукоўцаў – аспірантура.

Зразумела, перыядычныя структурныя перабудовы не з'яўляліся самамэтай, а мелі на ўвазе спрыянне пашырэнню і аптымізацыі навукова-даследчай працы ў рэспубліцы. Як сведчаць даследаванні і дакументальныя матэрыялы, менавіта з другой паловы 1920-х гадоў Інбелкульт пачынае ўсё больш упэўнена заяўляць пра сябе як аб беларускім цэнтры навуковай думкі. Няўдалая спроба арганізацыі Акадэміі навук да дзесяцігоддзя Кастрычніцкай рэвалюцыі мела і станоўчы бок – прыняцце акадэмічнага статута. З сакавіка 1928 г. думка аб своечасовасці рэарганізацыі ІБК у АН, адзначаў У.М. Ігнатоўскі, «будзе спатыкацца цяпер часта, як на Беларусі, так і ў СССР». І далей: «Паступова яна ўсё больш і больш будзе пашырацца і захапляць як партыйную, так і беспартыйную грамадскасць» [8, с. 24]. Пры такім развіцці падзей пераўтварэнне – перайменаванне, як часта пісалі ў той час, – ІБК у БелАН станавілася справай часу. Нагодай для яго даволі хуткага наближэння стаў 10-гадовы юбілей заснавання БССР.

У культурнай палітыцы кампартыі можна выдзеліць два палітычныя моманты ўнутранага і міжнароднага характару: яе дзейнасць у накірунку развіцця культур раней прыгнечаных нацый, пры тым што на ўвазе мелася сусветная ці хоць бы ўсееўрапейская сацыялістычная рэвалюцыя, і рэальны прыклад для нацыянальных дзеячоў у Заходняй Беларусі, які дысанансаваў з палітыкай Польшчы на «ўсходніх крэсах». Поруч з'явіліся падставы і ўласна навуковыя, як адзначана вышэй, а наяўная акадэмічная структура, апрабаваная за паўтара года, аблягчала здзяйсненне такога пераўтварэння.

З пачатку кастрычніка, з рашэння бюро ЦК КП(б)Б [8, с. 25], пачынаецца правядзенне практычных мерапрыемстваў па юрыдычным афармленні рэарганізацыі ІБК у АН. Зразумела, усе яны былі ўхваленыя вышэйшымі дзяржаўнымі органамі – саюзнымі і рэспубліканскімі СНК і ЦВК. У гэтым кантэксце ўяўляецца не зусім адэкватнай тагачаснай рэчаіснасці думка М.У. Токарава аб нечаканасці заявы старшыні СНК М.М. Галадзеда на сумесным пасяджэнні СНК СССР і БССР 9 кастрычніка 1928 г. аб рашэнні ўраду рэспублікі (ад 4 кастрычніка) пра рэарганізацыю ІБК у БАН, якое ў той самы дзень было ўхвалена СНК СССР. Нечаканасць гэтая выводзіцца з таго, што даследчыкамі не выяўлены канкрэтныя архіўныя матэрыялы аб канкрэтных рашэннях адпаведных органаў улады [1, с. 10]. Неадэкватнасць такога падыходу, на наш погляд, вынікае з наступнага: па-першае, агульнавядома, што ЦК Кампартыі з'яўляўся «першым сярод роўных» у пераліку ўладных інстанцый і без яго ўхвалення ніякія мерапрыемствы, нават значна меншага маштабу, чым стварэнне Акадэміі навук, імі не ажыццяўляліся; па-другое, аўтар прыведзенага меркавання не звярнуў увагу на інфармацыю У.М. Ігнатоўскага аб рэзалюцыі Прэзідыума Савета нацыянальнасцяў

ЦВК СССР па дакладу ўраду БССР у сакавіку 1928 г.: «... лічыць своечасовым і мэтазгодным рэарганізацыю... Інстытута ў Акадэмію навук». Зразумела, дадзенае рашэнне папярэдне павінна было быць ухваленае партыйнымі органамі. Што гэта мела месца, ускосна пацвярджае пазнейшая публікацыя М.У. Токарава, дзе прыводзіцца дакумент, з якога вынікае, што ЦК КП(б)Б звярнуўся па дадзеным «пытанні ў вышэйшыя партыйныя інстанцыі краіны яшчэ раз у студзені 1928 г.» [3, с. 32].

Такім чынам, практычная прапрацоўка пытання на саюзным узроўні пачалася як мінімум з пачатку вясны. Падаецца, не мае падставы і спасылка М.У. Токарава на партыйнае рашэнне ад 12 кастрычніка. Ён засяроджваецца на фразе У.М. Ігнатоўскага: «У першых лічбах кастрычніка Бюро ЦК КП(б)Б ... аднагалосна прыняло пастанову аб своечасовасці рэарганізацыі ІБК у БАН.» [8, с. 25]. Не мае падставы таму, што кіраўнік установы гаворыць менавіта пра «першыя лічбы», а не пра другую дэкаду ці сярэдзіну месяца, а таксама таму, што на тым пасяджэнні была прынятая да ведама пастанова ЦК ВКП(б), аб чым піша сам М.У. Токараў абзацам ніжэй [1, с. 10]. Відавочна, апошнія практычныя рашэнні прымаліся якраз на пачатку кастрычніка і былі агучаныя ў дакладзе М.М. Галадзеда, аб чым, відаць, «прагаварыўся» (а не «памыліўся» [3, с. 33]) партыйны друкаваны орган – газета «Зьвязда», датуючы пастанову чацвёртым днём кастрычніка. «Нечаканасці» ў падобных справах не маглі заканчвацца паспяхова. Так, няўдалай аказалася спроба арганізацыі Акадэміі навук у Грузіі, хоць ў верасні 1930 г. абвяшчалася аб яе адкрыцці і зацвярджаўся першы склад акадэмікаў. Нязгода Масквы пахавала гэту ідэю [27]. Відаць, цэнтральныя саюзныя ўлады не хацелі цяпер сваімі рукамі ствараць чарговае нацыянал-дэмакратычнае «кубло». Толькі праз два гады быў заснаваны Грузінскі філіял АН СССР, а Акадэмія адкрыта ў лютым 1941 г. [28, ст. 838] Такім чынам спыняліся спробы арганізацыі нацыянальных акадэмій «знізу», і, выглядае, Беларусь паспела ў апошні момант выцягнуць свой «шчаслівы білет».

Сігналам да непасрэдных дзеянняў паслужыла задавальненне Цэнтральным камітэтам ВКП(б) хадайніцтва бюро беларускага ЦК аб перайменаванні ІБК у БАН, прынятае да ведама апошнім 12 кастрычніка 1928 г. У той самы дзень бюро ЦК пастанавіла 14 кастрычніка апублікаваць у друку пастанову СНК Беларусі аб перайменаванні, праект якой даручылі скласці Корку, Чарвякову, Стасевічу [2, с. 14; 1, с. 10; 29, арк. 505]. Апублікаваная ў гэты дзень пастанова ЦВК і СНК ад 13 кастрычніка прадугледжвала заканчэнне рэарганізацыі ІБК у БАН да 1 студзеня 1929 г. [30].

Першымі правадзейнымі членамі (з тых, хто жыў і працаваў у БССР) трэцяй у СССР Акадэміі навук былі прызначаны 22 чалавекі, прычым дамінавалі прадстаўнікі гуманітарных дысцыплін – 14 асоб (64%), у тым ліку С.Я. Вальфсон, М.М. Дурнаво, З.Хв. Жылуновіч, І.І. Замоцін, У.М. Ігнатоўскі, В.Ю. Ластоўскі, Я.Ю. Лёсік, І.Д. Луцэвіч, С.Ю. Матулайціс, К.М. Міцкевіч, С.М. Некрашэвіч, У.І. Пічэта, Б.А. Тарашкевіч, А.М. Ясінскі.

Такім чынам, уяўляецца магчымым меркаваць, што з усталяваннем савецкай улады і пачаткам навукова-арганізацыйнага будаўніцтва ў рэспубліцы у тагачасных кіраўнікоў з'яўляецца думка аб стварэнні Акадэміі навук. Аднак рэальныя магчымасці, як фінансавыя, так і навуковыя, не спрыялі стварэнню БАН непасрэдна ў 1921 і 1927 гг. Тым не менш, дзякуючы велізарным намаганням, дадзеная ідэя ўсё ж набыла фактычнае ўвасабленне ў 1929 г. Тым самым быў створаны падмурак комплекснага развіцця навуковага сектара Беларусі, перспектыўнасць чаго спраўджана часам.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Токараў, М. Нараджэнне Беларускай Акадэміі навук / М. Токараў // Штогоднік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук ; рэдкал. М.П. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1999. – С. 6–12.

2. Токарев, Н.В. Академия наук Белорусской ССР: годы становления и испытаний (1929–1945) / Н.В. Токарев ; под. ред. В.А. Полуяна. – Минск : Наука и техника, 1988. – 182 с.

3. Токараў, М. Усевалад Ігнатоўскі і стварэнне Беларускай Акадэміі навук / М. Токараў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. – № 4. – С. 28–34.

4. Михнюк, В.Н. Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919–1941 гг.) / В.Н. Михнюк ; под ред П.Т. Петрикова. – Минск : Наука и техника, 1985. –286 с.

5. Лінднэр, Р. Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX–XX ст. / Р. Лінднэр ; нав. рэд. Г. Сагановіч. – СПб. : Неўскі прасцяг, 2003. – 540 с.

6. Академия наук Белорусской ССР / Н.И Голенчик [и др] ; редкол.: Н.А. Борисевич (председатель) [и др.]. – Минск : БелСЭ, 1979. – 600 с.

7. Інстытут беларускай культуры / М.П. Касцюк [і інш.] ; рэдкал. : М.А. Барысевіч [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 255 с.

8. Ігнатоўскі, У. Старонка з гісторыі культурнага будаўніцтва ў БССР / У. Ігнатоўскі // Бальшавік Беларусі. – 1928. – № 12. – С. 10–27.

9. Петрыкаў, П.Ц. Інстытуту беларускай культуры – 70 гадоў / П.Ц. Петрыкаў // Весці АН РБ. – Сер. гуманітар. навук. – 1992. – № 5–6. – С. 52–70.

10. Шаўчук, І.І. Арганізацыя навукі Беларусі ў пачатку 1920-х гадоў / І.І. Шаўчук // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. – № 8. – С. 15–20.

11. Палажэньне аб ІБК : паст. ЦВК і СНК БССР ад 25 ліпеня 1924 г. // ЗЗ БССР. – Аддз. І. – 1924. – № 18. – Арт. 161.

12. Материалы о работе Инбелкульта, Белорусской государственной и университетской библиотеки и Белорусского государственного академического театра (постановления, положения, циркуляры, доклады и др.) 18 января – 24 декабря 1924 г. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 42. – Воп. 1. – Спр. 535.

13. Анастасьин, Д. Начало трёх национальных академий // Д. Анастасьин, И. Вознесенский [Ф.Ф. Перченок] // Память. Исторический сборник. [Электронный ресурс]. – Москва, 1981; Париж: La Presse Libre, 1982. – Вып. 5. – С. 165–225 – Режим доступа : http://litcatalog.al.ru/periodics/Pamiat/Vyp05.html. – Дата доступа : 09.12.2007.

14. Прывітаньне Інстытуту Беларускае Культуры // Савецкая Беларусь. – 1925. – 14 ліп. – С. 3.

15. Протоколы научного совета и общих собраний членов института (1925 г.) // Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі (ЦНА НАНБ). – Фонд 67. – Спр. 12.

16. НАРБ. – Ф. 42. – Воп. 1. – Спр. 1254. Протоколы III конференции Главнаук союзных республик, тезисы докладов на 2-й Всероссийской конференции по среднему медицинскому образованию, устав Академии наук БССР и список учебных заведений УССР. 7 декабря 1925 г. – 20 сентября 1926 г.

17. Аб рэарганізацыі Інстытуту Беларускае Культуры : пастанова СНК БССР ад 12 лютага 1926 г. // ЗЗ БССР. – Аддз. І. – 1926. – № 51. – Арт. 189.

18. Выписки из протоколов заседаний политбюро и оргбюро ЦК ВКП(б), бюро ЦК КП(б)Б [докладные записки ЦК КП(б)Б в ЦК ВКП(б) о рассмотрении проекта Конституции БССР, политическом положении и мероприятиях по обеспечению

абороноспособности республики, увеличению ассигнований по госбюджету БССР и др. вопросам, описи секретных документов, возвращённых из ЦК КП(б)Б ЦК ВКП(б) после использования]. 1 февраля 1926 г. – 20 октября 1927 г. // НАРБ. – Ф. 4-п. – Воп. 1. – Спр. 3034.

19. Аб Інстытуце Беларускае Культуры : пастанова СНК БССР ад 10 ліпеня 1926 г. // ЗЗ БССР. – 1926. – № 29. – Арт. 106.

20. Сведения о состоянии народного образования БССР в 1926 г. // НАРБ. – Фонд 42. – Воп. 1. – Спр. 321.

21. Протоколы Президиума и секций Института Белорусской Культуры (1925 г.) // ЦНА НАНБ. – Фонд 67. – Спр. 9.

22. Фядосік, А.С. Ілюзорнасць і сапраўднасць: «Белыя плямы»ў гісторыі фальклярыстыкі 20-30-х гг. / А.С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. –77 с.

23. Ведомости на выдачу зарплаты работникам института (1926 г.) // ЦНА НАНБ. – Фонд 67. – Спр. 13.

24. Протоколы Президиума Центрального бюро краеведения (1926 г.) // ЦНА НАНБ. – Фонд 67. – Спр. 16.

25. Статут Інстытуту Беларускай Культуры : паст. СНК БССР ад 29 чэрвеня 1927 г. // ЗЗ БССР. – Аддз. I. – 1927. – № 31. – Арт. 158.

26. Няміга, Г. Інстытут беларускай культуры – Беларуская Акадэмія навук – Акадэмія навук Беларускай ССР / Г. Няміга. – Мюнхен, 1957. – 162 с.

27. Перченок, Ф.Ф. "Дело Академии наук" и "великий перелом" в советской науке / Ф.Ф. Перченок // Трагические судьбы: репрессированные ученые Академии наук СССР [Элетронный ресурс]. – 1995. – Режим доступа : http://russcience.chat.ru/perch95f.htm. – Дата доступа : 05. 02. 2006.

28. Стуруа, Н.И. Грузинская ССР / Н.И. Стуруа, Э.В. Хоштариа // Советская историческая энциклопедия : в 16 т. – М., 1963. – Т. 4. – С. 838.

29. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 3754. Протоколы № 48–54 заседаний бюро ЦК КП(б)Б, документы к ним. 12 октября – 9 ноября 1928 г.

30. 30. Аб рэарганізацыі Інстытуту Беларускае Культуры ў Беларускую Акадэмію Навук : пастанова ЦВК і СНК БССР ад 4 кастрычніка 1928 г. // Зьвязда. – 1928. – 14 кастр. – С. 1.

***Shauchuk I.*** **Transformation of the Institute of Belarusian Culture into the Belarusian Academy of Sciences**

The paper deals with the Belarusian Academy of Sciences formation. The problem is considered on basis of numerous sources both put into scientific circulation and unpublished ones. For the first time attention is paid to see attempts of the Academy of Sciences foundation, namely in 1921, 1927 and 1928/29. At that various reasons of such developments are analyzed, primarily political, socioeconomical and proper scientific ones. In conclusion there is accentuated objectively positive character of scientific-organizational structuring in the republic despite possible unscientific character motivation of the processes under consideration.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 25.02.10